Падтрымай "Вясну" на PATREON

Новыя штрафы і "суткі". Вынікі судоў у Брэсце, Маладзечне, Віцебску і Гродне дапоўнена

27.05.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў

У Брэсце завяршыўся суд над праваабаронцам Раманам Кісляком, якога абвінавачвалі ва удзеле ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах 12 красавіка і 3 траўня (шэсце "кармленне галубоў"). Суддзя суда Ленінскага раёна, вядомы вынясеннем палітычна матываваных рашэнняў, Аляксандр Семянчук пакараў Кісляка штрафам у 30 базавых велічынь (810 рублёў).

Нагадаем, што **Рамана Кісляка** затрымалі 10 траўня пасля чарговая шэсця супраць завода АКБ. Двое сутак не было дакладнай інфармацыі пра тое, дзе знаходзіцца Раман. Яго маці нават напісала заяву ў пракуратуру аб знікненні сына. 12 траўня праваабаронцу прывезлі на суд, аднак працэс перанеслі, а Рамана ў будынку суда зноў затрымалі. Ён прабыў у ізалятары часовага ўтрымання да новага суда 14 траўня, які ізноў перанеслі. У той дзень праваабаронца выйшаў на волю. Пасяджэнне па яго адміністрацыйнай справе пераносілася яшчэ адзін раз праз хваробу Кісляка і працягнулася 26 траўня.

Як судзілі Рамана Кісляка? Рэпартаж з пасяджэння 26 траўня.



У Брэсце судзяць праваабаронцу Рамана Кісляка. Суды прайшлі і ў Мінску з Лідай

Чарговае судовае паседжанне над праваабаронцам Раманам Кісляком распачалося ў судзе Ленінскага раёна горада Брэста сёння, 26 траўня.

У той жа час у Маладзечне 7 сутак арышту атрымаў **Андрэй Смаляк**. Яго судзілі па двух адміністрацыйных пратаколах па арт. 23.34 КаАП: за ўдзел у сустрэчы з Сяргеем Ціханоўскім і за акцыію па “кармленні галубоў”. Супраць яго сведчылі міліцыянты з мясцовага РАУС - **Вайтко і Сінько**. Суддзя - **Вікторыя Паляшчук**. Андрэй Смаляк атрымаў пастнову на рукі і паехаў да дому. Затрымаць яго могуць у любы момант.



Суд над Андрэем Смаляком

Расклад судоў за мірныя акцыі і сустрэчы да 1 чэрвеня.



Палітычны пераслед у траўні: прамежкавыя вынікі і расклад новых судоў

У Беларусі ў перыяд з 6 траўня зафіксавана каля 150 выпадкаў адвольных затрыманняў па палітычных матывах. Пад пераслед трапілі людзі, якія прыходзілі на сустрэчы з блогерам Сяргеем Ціханоўскім у розных гарадах краіны, выходзілі на акцыі ў яго падтрымку пасля затрымання блогера, “кармілі галубоў” на плошчах сваіх гарадоў ці ўдзельнічалі ў іншых акцыях пратэсту. Пад пераслед трапілі таксама праваабаронцы і журналісты, якія назіралі ці асвятлялі акцыі.

У **Віцебску** ў судзе Першамайскага раёна асудзілі затрыманага напярэдадні **Аляксея Саламаненку.** Ён атрымаў **25 базавых велічынь штрафу (675 рублёў)** за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. На мінулым тыдні Аляксея судзілі за акцыю "кармленне галубоў", і тады суддзя **Алена Цыганкова** аштрафавала яго на 540 рублёў. Той працэс адзначыўся канфліктам прысутных у залі з суддзёй, на якую выклікалі міліцыю.



Віцебская суддзя не змагла выдаліць з залы 15 чалавек на працэсе Аляксея Саламаненкі

Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 22 траўня разглядаў справу актывіста «Краіны для жыцьця» Аляксея Саламаненкі, якога вінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве – «кармленьні галубоў». Па інфармацыі "Віцебскай Вясны", суддзя Алена Цыганкова аштрафавала яго на 540 рублёў, але рашэнне прымала за закрытымі дзвярыма і без удзелу самога абвінавачанага.

У **Гародні** на **40 базавых велічынь (1080 рублёў)** аштрафавалі актывіста **Мікалая Саляніка**. Па яго словах, з дому яго выманілі падманам - яго выклікалі прыехаць у Ленінскі РАУС, каб правесці дадатковае апытанне пра ранейшае адміністрацыйнае правапарушэнне. У РАУС у Саляніка забралі мабільны тэлефон і завялі ў актавую залу. Там неўзабаве з'явіўся суддзя суда Ленінскага раёну **Дзмітрый Бубенчык**. Ён і аштрафаваў Саляніка за сустрэчу 26 красавіка з блогерам Сяргеем Ціханоўскім у Гародні.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

